# *Ратуемся спадчынай*

✓**12 лістапада** ў галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі прайшло **мерапрыемства, прысвечанае 115-годдзю з дня нараджэння Яна Скрыгана** (1905 – 1992), пісьменніка, сябра літаратурнага аб'яднання «Маладняк». Імпрэза арганізаваная ў межах сумеснага праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця», што рэалізуецца НББ, Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры, Выдавецкім домам «Звязда» і Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва. Прысутныя даведаліся пра жыццё і творчасць выдатнага літаратара, стваральніка беларускага нарыса як новага літаратурнага жанру. Сумеснымі намаганнямі ўдзельнікаў праекта быў падрыхтаваны віртуальны раздзел, прысвечаны юбілею Я. Скрыгана. Ён змяшчае поўныя тэксты кніг аўтара, каштоўныя дакументы, фотаздымкі і архіўныя матэрыялы з фондаў НББ, партнёраў і з хатняга архіва пісьменніка.

Дачка пісьменніка Галіна Іванаўна Скрыган расказала пра свайго бацьку, пра захаванне спадчыны пісьменніка яго сям'ёй. Апошнім часам яна з'яўляецца ўкладальніцай кніг, што выходзяць да кожнага юбілею пісьменніка. На вечарыне яна прадставіла ілюстраваны альбом «Фоталетапіс з хатняга архіва Яна Скрыгана» (2020), выдадзены да 115-годдзя пісьменніка.

Пра пісьменніка расказалі таксама галоўны рэдактар выдавецтва «Кнігазбор» і аўтар праекта «Беларускі кнігазбор» Кастусь Цвірка і сябра сям'і пісьменніка Яўген Жук, загадчык аддзела алічбоўкі НББ. У відэазапісе прагучала музычнае прысвячэнне дзядулю ад Яна Скрыгана-малодшага – вядомага выканаўцы твораў на класічнай гітары, які з канцэртамі аб'ездзіў шмат краінаў, а цяпер жыве пад Фрайбургам.